# Новинки книг




Багдановіч, М. А. Цвяток радзімы васілька : вершы / уклад. В. Шніп. – Мінск : Звязда, 2024. – 105 с.

*Кніга змяшчае паэтычныя творы класіка айчыннай літаратуры Максіма Багдановіча са зборніка «Вянок», а таксама вершы розных гадоў. Творчасць паэта ўяўляе сабой яркі прыклад беларускай філасофскай, пейзажнай, грамадзянскай і любоўнай лірыкі.*




Беланожка, А. Дзіця зямлі : Фантастычныя апавяданні / Беланожка Алена. – Мінск : Звязда, 2023. – 206 с.

*У кнігу ўвайшлі апавяданні, створаныя ў жанрах рамантычнай фантастыкі, фэнтэзі і антыўтопіі. На старонках твораў узнімаюцца філасофскія, маральныя, гуманістычныя пытанні. Аўтар разважае на тэмы кахання і адзіноты чалавека ў Сусвеце, навуковай этыкі і тэхнічнага прагрэсу, малюе магчымыя шляхі развіцця грамадства. Кніга адрасавана шырокаму колу чытачоў.*




Дудзюк, З. І. Сыны Рарога : раман, апавяданні / Дудзюк З. І. – Мінск : Беларусь, 2024. – 222 с.

*Гістарычны прыгодніцкі раман "Сыны Рарога" створаны на аснове звестак, пачэрпнутых з хронік такіх летапісцаў, як Адам Брэменскі, Саксон Граматык, Гельмальд з Басау і інш. Дзеянне ў ім адбываецца ў канцы першага тысячагоддзя, у эпоху праўлення Карла Вялікага і яго нашчадкаў. Аўтар апавядае пра барацьбу славян рарогаў-абадрытаў супраць заваёўнікаў франкаў і данаў. Славянскі князь Дражка, яго браты Годслаў і Славамір, а таксама і сын Чаладраг, адстойваючы незалежнасць уласнага княства, імкнуцца захаваць веру і самабытнасць супляменнікаў. Тыя даўнія падзеі, апісаныя ў кнізе, не толькі адгукаюцца сёння ў нашай рэчаіснасці праз тапонімы, прозвішчы, звычаі і абрады, але і дзіўным чынам высвечваюць для нас падзеі сучаснасці.*




Зямлі нязгаснае святло : вершы паэтаў Віцебшчыны / уклад. В. Шніп. – Мінск : Звязда, 2023. – 137 с.

*Пад вокладкай паэтычнага зборніка «Зямлі нязгаснае святло» знакамітых паэтаў Віцебшчыны Алега Салтука, Янкі Сіпакова і Анатоля Канапелькі сабраны лепшыя прыклады іх самаадданай творчай працы: вершы пра любоў да малой радзімы і сувязь з мінулым, прысвячэнні, а таксама шчырая любоўная і філасофская лірыка.*




Калуженина, Л. А. Феодосийская баллада : повести и рассказы / Калуженина, Л. А. – Минск : Беларусь, 2023. – 215 с.

*Сборник рассказов и повестей Ларисы Калужениной, написанных за последнее десятилетие, охватывает широкий круг как исторических, так и современных тем. Главное для автора — поиск настоящего, родного, своих корней. Проза жизни, проза быта превращается у нее в тонкое, часто поэтическое, психологически достоверное полотно, в увлекательное повествование с ярким, неожиданным сюжетом. Герои ее рассказов разнообразны: от руководителей предприятий, бизнесменов, журналистов, писателей и художников до тех, кого принято называть «простыми людьми», — наших современников. Их судьбы всегда вызывают интерес и сочувствие —редкое качество для современной прозы.*




Круковский, В. П. Ожерелье из Финикии, или Три тысячи лет преступлению : детективный роман / Круковский В. П. – Минск : Беларусь, 2023. – 135 с.

*Новая книга Виктора Круковского – это не просто детективный, но и исторический роман. Автор, в лице следователя на пенсии, предлагает проследить за историей загадочного финикийского ожерелья – мистического артефакта, вокруг которого раз за разом на протяжении тысяч лет развивались таинственные и хитросплетенные сюжеты. В них – жажда наживы и самопожертвование, жестокость и милосердие, вероломство и возмездие, ненависти любовь. Все это делает повествование живым и интригующим.*




Мажылоўскі, У. Б. Праклён мітрапаліта Феофіла : аповесці / Мажылоўскі, У. – Мінск : Звязда, 2014. – 285 с.

*«Велебнаму ў Бозе айцу Іосіфу мітрапаліту Кіеўскаму і ўсёй Русі, ад Мікалая Мікалаевіча, ваяводы Віленскага, канцлера гаспадара караля яго міласці Жыгімонта і ад Станіслава Пятровіча, маршалка земскага, старосты гарадзенскага, паклон і прыязнь», — пісаў каралеўскі канцлер, віленскі ваявода Мікалай Радзівіл. Пісаў у Вільні, студзеня ў 25 дзень, проста, без усялякіх «красамоўных вывіхаў, адхіленняў і іншасказанняў». «Паведаем тваёй міласці, што па волі мілага бога, ранейшай гаспадарыні нашай, каралеўскай яе міласці ў жывот не стала. Бог душу яе з гэтага свету ўзяў, засмуціўшы ўсіх нас, падданых гаспадарскіх...»*

| | |
|---|---|
|  | Маразлюк, І. А. Сімвалы беларускай вечнасці : гісторыя сімвалаў беларускай дзяржаўнасці / Марзалюк, І. А. – Мінск : Беларусь, 2023. – 317 с. : іл.<br>*Гэта выданне нарадзілася з праекта канала «Сталічнае Тэлебачанне» — «Сімвалы беларускай вечнасці». І тэлепраект, і гэта кніга — пра самае галоўнае для аўтара як для гісторыка, беларуса і чалавека, для якога словы «Радзіма» і «патрыятызм» — не пусты гук. Яна — пра веліч беларускай гістарычнай традыцыі і дзяржаўнасці, пра нашы сімвалы і вытокі, пра нас, пра нашых продкаў. У кнізе ідзе гаворка аб шляху Беларусі да сучаснай суверэннай дзяржавы. Галоўная ўвага ў ёй акцэнтуецца на нашых нацыянальных традыцыях, на іх вытоках, якія ўвасоблены ў сучасным беларускім дзяржаўным ладзе.* |
|  | Ненадавец, А. М. Лес і чалавек / Ненадавец А. М ; Я. А. Ненадавец. – Мінск : Беларуская навука, 2024. – 236 с.<br>*Кніга прысвечана адвечнай тэме – узаемаадносінам лесу і чалавека, прыроды і грамадства, якая ў будзённым жыцці асацыіруецца з ростам чалавека (маленствам, юнацтвам, сталасцю і старасцю), які нібыта прымяраецца да навакольных лясоў і пушчаў, без якіх беларус ніколі сябе не ўяўляў і пацвярджаецца гэтая глыбокая любоў да лясоў усемагчымымі легендамі і паданнямі, гісторыямі і казкамі, павер'ямі і прымхамі. Так пайшло з даўніх часоў, што лес выступаў не проста суцэльнай «зялёнай масай», а быў адухоўленым сябрам чалавека, які дапамагаў у жыцці, ратаваў і падтрымліваў у цяжкую хвіліну.* |
|  | Сіўко, Ф. І. Што раньш было : 3-е выл., удакл. дап. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2024. – 99 с.<br>*У гісторыка-краязнаўчых нарысах, што складаюць кнігу, прыводзяцца малавядомыя факты: роль беларускіх харугваў у разгроме крыжакоў пад Грунвальдам, няпростыя адносіны беларусаў з татарамі і украінскімі казакамі. А таксама: што стаяла за трагедыяй Барбары Радзівіл - няшчаснае каханне ці халодны разлік тых, хто прагнуў улады; ці апраўдана называлі сучаснікі здраднікам апошняга вялікага князя Вялікага княства Літоўскага і караля Польшчы Станіслава Панятоўскага? На гэтыя і іншыя пытанні аўтар спрабуе даць адказ. Разлічана на аматараў беларускай мінуўшчыны.* |
|  | Традыцыйны светапад беларусаў. У 5 кн. Кн. 2. Сфера сакральнага. Народная тэалогія / уклад. І.М. Дубянецкая., С. І. Санько. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 89 с.: іл.<br>*У другой кнізе серыі, прысвечанай ключавым тэмам, вобразам і канцэптам традыцыйнага светапогляду беларусаў, гаворка ідзе пра ўяўленні аб шматмернай сакральнай сферы чалавечага досведу, Бога і боскага свету, адносінах паміж Богам і чалавекам, элементах веры і культу. Адрасавана шырокаму колу чытачоў.* |

| | |
|---|---|
|  | “Шчаслівы, што пяю цябе, радзіма…” / уклад. К. В. Часнакова : з. навук. арт., да 110-годдзя з дня нарадж. нар. паэта Беларусі М. Танка і да Дня нар. адзінства. – мінск : Беларуская навука, 2024. – 199 с.<br>*У зборніку даследуецца жыццё і творчасць Максіма Танка. Аўтары прасочваюць працэс фарміравання творчай індывідуальнасці паэта-рэвалюцыянера, паэта-франтавіка, паэта-патрыёта, паэта-гуманіста, раскрываюць своеадметнасць духоўна-філасофскага зместу яго асобы, глыбіню і арыгінальнасць ідэйна-мастацкіх пошукаў, спецыфіку творчага майстэрства, выяўляюць уплыў асобы і творчасці М.Танка на развіццё сучаснай беларускай паэзіі.* |
|  | Черкашин, Н. А. Генералы сорок первого года : роман / Николай Черкашин. – Мінск : Звязда, 2023. – 301 с.<br>*Действие нового романа известного военного писателя Николая Черкашина разворачивается в приграничных районах Западного Особого военного округа в предвоенный год и в первые десять дней после вероломного нападения фашистской Германии на Советский Союз. Наряду с судьбой главного героя – командующего 10-й армией, базирующейся в так называемом Белостокском выступе, генерал-майора Голубцова – представлены судьбы его соратников, других генералов 1941 года, а также младших командиров, сержантов и рядовых красноармейцев. Развернута широкая панорама боевых действий отступающих частей РККА, оказавших серьезное сопротивление превосходящим силам противника.* |
|  | Чиж-Литаш, А. П. Убийство в поезде Минск-Брест : детективный роман / Анна Чиж-Литаш. – Минск : Звязда, 2024. – 158 с.<br>*В поезде Минск-Брест находят тело молодого мужчины без признаков насильственной смерти. Кроме того, у его жены – дочери известного банкира – пропали драгоценности и кредитные карты. Совпадение ли это? Или все же мужчина умер не своей смертью? Полковник Виноградов, едущий в соседнем купе, берется за дело. На расследование у него есть всего шесть часов.* |